Источник: "Звязда" - 2019-01-03

# Марка да 100-годдзя БССР

**Учора Міністэрства сувязі і інфарматызацыі выпусціла ў абарачэнне паштовую марку «100 гадоў БССР». Урачыстая цырымонія гашэння адбылася ў Мінску.**



Фота БелТА.

У ёй прынялі ўдзел міністр сувязі і інфарматызацыі Канстанцін Шульган і акадэмік-сакратар аддзялення гуманітарных навук і мастацтваў НАН Беларусі Аляксандр Каваленя.

— Утварэнне БССР — гэта найважнейшая падзея ў жыцці краіны, якая мусіць заставацца ў памяці. Тое, што гэта адлюстравана ў выглядзе паштовай маркі, вельмі значна і неабходна», — зазначыў Канстанцін Шульган.

— Што такое стагоддзе? Гэта ўсяго толькі імгненне ў гісторыі, але за гэты час беларусы паспелі дасягнуць вельмі многага. Мы і нашы продкі зрабілі ўсё, каб Беларусь квітнела, — сказаў Аляксандр Каваленя.

Марка аддрукавана тыражом у 60 тысяч экзэмпляраў. Яе дызайн распрацавала Алена Мядзведзь. Намінал маркі адпавядае тарыфу на перасылку простага ліста масай да 20 грамаў уключна па тэрыторыі Беларусі.

А ў мінскім аддзяленні паштовай сувязі № 1 адбылося спецыяльнае гашэнне на канверце «Першы дзень».

**Валяр'ян ШКЛЕННІК.**

Валяр'ян Шкленнік. Марка да 100-годдзя БССР